3) наяўнасць палёў: *капялюш*, *панама*, *каўбойка*, *самбрэра*, *кацялок*; 4) наяўнасць дадатковых элементаў, у выглядзе казырка, завязак, упрыгожванняў: *капар*, *каптур*, *карона*, *канфедэратка 1*, *бесказырка*, *каскетка*, *мічманка*, *кепка*, *картуз*, *каўбойка*.

Фактычны матэрыял дазволіў вылучыць невялікую групу лексем, дэфініцыі якіх утрымліваюць толькі адну-дзве дыферэнцыйныя прыкметы. Так, напрыклад, значэнне лексемы *карона 1* падаецца як 'галаўны ўбор з каштоўнымі ўпрыгожаннямі, які з'яўляецца знакам улады манарха'; *кучомка* — 'шапка футрам наверх'; *вушанка* — 'шапка з вушамі'; *кашміроўка* — 'кашміровая хустка'; *лямцоўка* — 'капялюш, зроблены з лямцу'.

Як паказаў структурна-семантычны аналіз, назвы галаўных убораў адносяцца да канкрэтнай лексікі, для якой істотным з'яўляецца дакладнае ўказанне на дэнатат, а гэта магчыма толькі пры адлюстраванні многіх семантычных кампанентаў у структуры дэфініцыі. Такім чынам, лексемы, што з'яўляюцца назвамі галаўных убораў, можна аднесці да групы высокага ўзроўню сістэмнасці.

**Спіс крыніц**

1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы). — Мінск : БелСЭ, 1977—1984.

***Дз. І. Сегіневіч***
*Навуковы кіраўнік — Т. М. Пучынская*
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ЖАНРАВАЯ СПЕЦЫФІКА НАВЕЛ Г. МАРЧУКА «ДАВЫД-ГАРАДОЦКІЯ КАНОНЫ»

Георгій Васільевіч Марчук — вядомы пісьменнік і грамадскі дзеяч сучаснасці, тэатральны крытык і выдатны публіцыст. Яго творчасць адметная ў сучаснай беларускай літаратуры сваім ідэйна-тэматычным зместам. Асноўная мастацкая задума пісьменніка — «уславіць з сардэчнай цеплынёю правінцыю». У асобе Г. Марчука сучасная беларуская проза займела выдатнага палескага песняра і бытапісца. Бязмежна ўлюблёны ў сваю малую радзіму, у родны Давыд-Гарадок, Г. Марчук малюе ў празаічных творах яркія, запамінальныя і праўдзівыя карціны працы, побыту, душэўнага стану землякоў-палешукоў [1, с. 26].

Крытыкі яго творчасці (А. Багамолава, У. Сенькавец) справядліва адзначаюць каларытнасць вобразаў Г. Марчука. Звяртаючыся да гісторыі Палескага краю, пісьменнік імкнецца ўбачыць у характары свайго народа тыя рысы і якасці, якія робяць яго паўнапраўнай часткай агульначалавечай супольнасці. Творчыя парывы Г. Марчука «скіраваны на абуджэнне і выхаванне ў чалавеку любові да ўсяго жывога, здольнасці спачуваць слабаму і пакрыўджанаму, абараніць дабро перад злом. Глыбокі сэнс набывае паняцце адданасці таму, што для чалавека з'яўляецца найбольш блізкім і дарагім у жыцці» [4, с. 33].

Па ідэйна-мастацкіх асаблівасцях «малая» проза Г. Марчука традыцыйная, але жанравая форма яго твораў здзіўляе сваёй разнастайнасцю (раманы, п'есы, навелы, казкі, кінасцэнарыі, афарызмы) і наватарствам (навела-канон).

Літаратуразнаўцы (А. Макарэвіч, У. Сенькавец) імкнуцца даследаваць у сучаснай літаратуры тэндэнцыю да жанравых мадыфікацый. Яскравым прыкладам жанравага сінтэзу з'яўляецца навела-канон Г. Марчука — літаратурны факт, які патрабуе навуковага асэнсавання. Звернемся да цыклу «Давыд-гарадоцкія каноны», які вывучаецца ў 11 класе сярэдняй школы і ўключае наступныя творы: «Канон Богу», «Канон Гарыні», «Канон Хаце», «Канон Вуліцы», «Канон Агароду», «Канон Школе», «Канон Ветру», «Канон Базару», «Канон Часу», «Канон Маці». Яны прысвечаны роднай зямлі пісьменніка, людзям, якія на ёй жывуць. Давыд-Гарадок — унікальны куток Беларусі, бацькоўскі дом, пакланенне якому — правіла, норма жыцця чалавека.

Творы з цыклу «Давыд-гарадоцкія каноны» ўяўляюць сабой жанравы сінтэз навелы і канона. Навела нарадзілася з анекдота — жартоўнага народнага апавядання з вельмі дасціпнай, нечаканай канцоўкай, апавяданне з'явілася пазней на аснове навелы. Такім чынам, разнавіднасці твораў малой эпічнай формы (анекдот — навела — апавяданне) можна разглядаць як этапы эвалюцыі апавядання, якое паступова стала адным з галоўных жанраў эпасу. Навела — жанравая форма апавядання, для якой характэрныя «востры цэнтраімклівы сюжэт, нярэдка парадаксальны, адсутнасць апісальнасці, кампазіцыйная строгасць, крайняя аголенасць сюжэтнага ядра — цэнтральнай перыпетыі, зведзенасць жыццёвага матэрыялу ў фокус адной падзеі» [5, с. 6]. У прозе Г. Марчука навела спалучаецца з жанравай формай канона. Само слова «канон», як вядома, мае некалькі значэнняў, адно з якіх — традыцыя, абавязковая норма, другое — правіла, палажэнне. Сам аўтар дае наступнае тлумачэнне слова «канон» (ад грэчаскага «норма») — адна з форм песнапення, якая ўяўляе сабой дыялог паміж чытальнікам і хорам [1, с. 27]. Паводле тлумачальнага слоўніка, канон — «збор палажэнняў, якія носяць дагматычны характар, г. зн. непарушныя, непадлеглыя крытыцы» [2, с. 55]. У масавай свядомасці канон — усё тое, што цвёрда ўстаноўлена, стала агульнапрынятым. Біблейскі канон складаюць кнігі Бібліі, якія больш аўтарытэтна за ўсе іншыя напісаныя крыніцы даюць правілы як веры, так і жыцця. У літаратурных навелах-канонах Так, Г. Марчука канкрэтнае, пабытавае таксама цесна звязана з сакральным,

духоўным, як і ў кнігах рэлігійнага зместу. Толькі тады, калі душа чалавека напоўнена і нават перапоўнена жаданнем рабіць дабро, калі розум накіраваны на стварэнне, тады ёсць вялікі сэнс у жыцці, тады чалавек кланяецца ўсяму святому і жывому — «Хаце» і «Агароду», «Вуліцы» і «Базару», «Гарыні» і «Ветру», «Школе» і «Часу», «Маці» і «Богу».

Такім чынам, далёка не кожны аўтар мае ў сваёй творчай скарбонцы такія жанрава разнастайныя, тэматычна разнапланавыя творы, як Г. Марчук. Самабытнасць і вышыня таленту пісьменніка, глыбіня і непаўторнасць яго душы ўвасобіліся праз каларытнае беларускае слова ў п'есах, апавяданнях, раманах, навелах, афарызмах, канонах, казках, сцэнарыях. Асабліва цікавую старонку ў творчасці пісьменніка ўяўляюць «Давыд-гарадоцкія каноны», паколькі названы жанр (навела-канон) з'яўляецца рэдкім і нават выключным у сучаснай беларускай літаратуры. Г. Марчук здолеў сказаць сваё адметнае слова пра «малую» радзіму — беларускае Палессе з яго самабытным укладам жыцця, адметнымі звычаямі і традыцыямі, звярнуўшыся да жанравай формы навелы-канона з яе духоўным, сакральным сэнсам.

## Спіс крыніц


1. *Белая, А. І.* Вывучэнне творчасці Георгія Марчука ў школе / А. І. Белая // Беларус. мова і літаратура. Серыя «У дапамогу педагогу». — 2009. — № 2. — С. 26—32.
2. *Лугоўскі, А. І.* Слоўнік студэнта-філолага па методыцы выкладання беларускай літаратуры / А. І. Лугоўскі. — Мінск : БДПУ, 2006. — 127 с.
3. *Макарэвіч, А. А.* Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік / А. А. Макарэвіч. — Мінск : Выш. школа, 1969. — 565 с.
4. *Мішчанчук, М. І.* Беларуская літаратура XX стагоддзя : вуч. дапаможнік / М. І. Міншчанчук, І. С. Шпакоўскі. — Мінск : Выш. школа, 2001. — 352 с.
5. *Сенькавец, У. А.* Вывучэнне творчасці Георгія Марчука ў 11 класе / У. А. Сенькавец // Родн. слова. — 2009. — № 12. — С. 78—81.



***К. Ф. Талкун***
*Навуковы кіраўнік — Т. М. Пучынская*
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь


# ПРАБЛЕМА ЧАЛАВЕЧАГА ШЧАСЦЯ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА І АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

Сапраўдная паэзія — пакутлівая споведзь. Незвычайны сплаў «пропаведзі і споведзі», глыбока ўзрушанай лірыкі і палымянай трыбуннай публіцыстыкі ўяўляе сабою паэзія народных паэтаў Беларусі Максіма Танка і Аркадзя Куляшова. Вынік іх творчасці — сапраўды глыбокая грамадзянская лірыка самай высокай пробы.

Паэты пражылі вялікае і няпростае жыццё, насычанае рознымі, у тым ліку і драматычнымі падзеямі. Яны прайшлі нялёгкімі франтавымі дарогамі ваеннага часу, заўжды падзяляючы лёс і трывогі свайго народа. Максім Танк і Аркадзь Куляшоў — паэты з абвостраным пачуццём праўды, справядлівасці, шчырасці, дабрыні.

Абодва паэты прыйшлі ў літаратуру імкліва і ўпэўнена. Яны з'яўляюцца і філосафамі, якія імкнуцца паказаць складанасць і супярэчлівасць жыцця, і публіцыстамі, выказваючы свае погляды на сусвет, і лірыкамі, якім даступны таямніцы чалавечай душы [1, с. 78].

Максім Танк і Аркадзь Куляшоў аднолькава імкнуцца знайсці адказ на філасофскае пытанне, што ж такое шчасце, у чым сэнс чалавечага жыцця. Яны сцвярджаюць, што шчасце — гэта той свет, што знаходзіцца побач, тое гарманічнае, сапраўднае, шчырае, людскае, вечнае, без чаго не можа існаваць чалавек. Паэты знаходзяць уласны адказ на складанае пытанне быцця. Прыкладамі могуць служыць вершы М. Танка «Шчасце» і А. Куляшова «Спакойнага шчасця не зычу нікому…».

Максім Танк нічога новага, здаецца, не сказаў пра сутнасць чалавечага шчасця, яго погляды адпавядаюць народнай традыцыі сцвярджэння простых і разам з тым мудрых ісцін. Шчасце — гэта «адвечная праца, гэта крута пасоленая луста хлеба на стале, гэта родны небасхіл і зямля наша, гэта мацнейшая ад смерці дружба, і, канешне ж, шчасце — гэта песня, гэта далучэнне да мастацтва, да прыгажосці» [5, с. 69]. На думку М. Танка, калі чалавечае жыццё хуткаплыннае, дык гэта азначае, што нельга марна траціць час, трэба не чакаць шчасця, а настойліва шукаць яго, вучыцца бачыць гармонію і ісціну ў паўсядзённых простых рэчах.

Майстэрства М. Танка захапляе здольнасцю паэта шырока ахапіць з'явы, энцыклапедычна падабраць жыццёвую інфармацыю ў вершы. Паэт удала спалучае глыбіню думкі з класічнай прастасцю яе ўвасаблення. Такім жа шляхам ідзе і А. Куляшоў. Сэнс яго верша «Спакойнага шчасця не зычу нікому…» даволі просты па форме, але ў той жа час глыбокі па змесце. Спакойнае пастаяннае шчасце — адсутнасць яго. «Атлусцелае» сэрца не ўспрымае «неспакой» прыроды, часу, самой асобы. Чалавек шчаслівы ў дзеянні, у кіпенні страсцей, у вечных пошуках ісціны, сэнсу, праўды, дабра, харства [3, с. 149]. Пра чалавечае шчасце А. Куляшоў гаворыць дастаткова часта, зноў і зноў сцвярджаючы, што людзі не павінны, не маюць права быць нешчаслівымі. Вось чаму паэту здаецца надзвычай важным людское спачуванне, якое здольна тварыць цуды. І наадварот, самым вялікім няшчасцем бывае страта чалавечага даверу [2, с. 221].